Славутыя суайчыннікі

# ГРАФ МІХАЛ КЛЕАФАС АГІНСКІ – ПАЛІТЫЧНЫ ДЗЕЯЧ, ПАТРЫЁТ, КАМПАЗІТАР

## Грамадска-палітычная дзейнасць і музычна-мастацкая творчасць знакамітага земляка

**А. І. Смолік,**
загадчык кафедры культуралогіі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва,
доктар культуралогіі, прафесар



**Сёлета ў кастрычніку спаўняецца 250 год з дня нараджэння Міхала Клеафаса Агінскага (1765–1833). Прадстаўнік старажытнага арыстакратычнага роду, буйны палітычны дзеяч, таленавіты кампазітар – асоба, якая пакінула свой, адметны след у гісторыі. Сведчанне яе масштабу – рашэнне ЮНЕСКА аб'явіць 2015 год годам М. К. Агінскага.**

**Такім чынам, юбілей нашага славутага земляка будзе шырока адзначацца не толькі ў Беларусі, але і ў Літве, Польшчы, Італіі, Францыі і іншых краінах свету.**

### Нашчадак магнацкага роду

Міхал Клеафас Агінскі нарадзіўся 25 верасня 1765 г. у маёнтку Гузаў Мазавецкага ваяводства непадалёк ад Варшавы. Бацька хлопчыка запрасіў для выхавання сына аднаго з лепшых гувернёраў Еўропы Жана Ралея. Да гэтага Ралей быў выхавальнікам эрцгерцага Леапольда (будучага аўстрыйскага імператара Леапольда ІІ). У Гузаве французскі педагог пражыў 11 гадоў. Ён выхоўваў юнага Міхала такім чынам, каб забяспечыць нашчадку славутага магнацкага роду высокі ўзровень і інтэлектуальнага, і фізічнага развіцця. У ліку прадметаў, вывучаемых хлопчыкам, былі старажытная гісторыя і гісторыя Новага часу, лацінская, французская, нямецкая і польская мова і літаратура, палітэканомія, грамадзянскае права, геаграфія, батаніка, матэматыка, геаметрыя, каліграфія, нумізматыка, танцы.

Навучалі хлопчыка і музыцы. Прычым ён авалодваў не толькі майстэрствам ігры на музычных інструментах (скрыпка, фартэпіяна), але і асновамі кампазіцыі. Так, яго настаўнікам музыкі быў славуты кампазітар і арганіст Восіп Казлоўскі, будучы аўтар першага гімна Расійскай імперыі. У будучым Міхал Клеафас Агінскі ўдасканальваў свае музычныя навыкі з дапамогай такіх знакамітых віртуозаў, як Ё. Вёльфль, Дж. Б. Віёці, П. Баё, Ш. Ляфон [3, с. 35].

Жан Ралей, шчыры і добры настаўнік, дапамог юнаку засвоіць важнейшыя палажэнні філасофіі рамантызму, прынцыпамі якога на працягу ўсяго жыцця кіраваўся Міхал Клеафас. У сваіх мемуарах Агінскі пісаў: «Мой настаўнік удыхаў у мяне ідэі свабоды, якія грунтаваліся на ідэях хрысціянства, што прымушала глядзець на чалавека як на брата. Аднойчы, калі, раззлаваўшыся, я аблаяў і ўдарыў аднаго са слуг сваіх бацькоў, ён загадаў мне цалаваць таму ногі ў прысутнасці іншых. Мне было тады 10 гадоў» [1, с. 43].

Жыццёвая пазіцыя Міхала Клеафаса вынікала з ідэі свабоды і веры ў яе. Зыходзячы з гэтага, ён, як і большасць прадстаўнікоў яго роду, аддана служыў радзіме, годна прадстаўляў сваю краіну за яе межамі. Ужо ў 19-гадовым узросце, у 1784 г., Агінскі стаў дэпутатам сойма, а з 1789 г. служыў паслом Рэчы Паспалітай у Нідэрландах і Вялікабрытаніі, а ў 1793 г. ва ўзросце 28 гадоў стаў Вялікім падскарбіем (міністрам фінансаў) Вялікага Княства Літоўскага. Да сваіх абавязкаў малады граф ставіўся вельмі адказна. За кароткі час здолеў праверыць усе мытныя пасты на мяжы Літвы з Расіяй (ад Палангі да Бярэсця) і выявіць шмат злоўжыванняў.



## На чале батальёна паўстанцаў



Адданасць Міхала Клеафаса Айчыне, гатоўнасць дзеля яе свабоды ахвяраваць маёнткамі і нават уласным жыццём яскрава праявіліся ў яго барацьбе супраць падзелу Рэчы Паспалітай. Граф Агінскі рашуча змагаўся з магнатамі, якія стварылі ў 1792 г. прарасійскі саюз (Таргавіцкую канфедэрацыю) з мэтай знішчэння прагрэсіўных рэформ Чатырохгадовага сойму і адмены Канстытуцыі 1791 г. У выніку велізарнай ваеннай, фінансавай і дыпламатычнай падтрымкі, аказанай дэпутатам гэтай канфедэрацыі з боку Расійскай імперыі, Агінскі і яго паплечнікі пацярпелі паражэнне. Адбыўся другі падзел Рэчы Паспалітай. Большасць прадстаўнікоў шляхты, каб захаваць свае маёнткі і атрымаць належны чын ад расійскіх улад, прысягнулі на вернасць імператрыцы Кацярыне II. Міхал Клеафас не здрадзіў сваім прынцыпам і прысягаць імператрыцы адмовіўся. Яго жыццё аказалася ў небяспецы. Каб выратаваць сябе і сваіх блізкіх, граф вымушаны быў эмігрыраваць у Прусію. Яго маёнткі новая ўлада канфіскавала.

У 1794 г. Расія, Аўстра-Венгрыя і Прусія распачалі актыўную дзейнасць па канчатковым знішчэнні дзяржаўнасці ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Патрыятычна настроеная шляхта пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі пачала фарміраваць паўстанцкія атрады з мэтай захавання незалежнай дзяржавы на тэрыторыі, яшчэ не захопленай акупантамі. Міхал Клеафас без ваганняў далучыўся да віленскіх паўстанцаў, увайшоў у склад Найвышэйшай літоўскай рады. На патрэбы паўстання ён ахвяраваў 188 тыс. злотых. На гэтыя сродкі Агінскі сфарміраваў батальён стралкоў у колькасці 480 чалавек і ўзначаліў яго. І камандзір, і байцы мужна змагаліся супраць прускіх і расійскіх узброеных фарміраванняў. Атрад Агінскага вызначыўся ў бітве пад Дынабургам (Даўгаўпілс), у баях на подступах да Мінскай губерні. У адной з сутычак з царскім войскам Міхал Клеафас ледзь не загінуў. Каб падтрымаць баявы дух паплечнікаў па зброі, Агінскі стварае шэраг маршаў і баявых песень. Асабліва папулярным у касцюшкаўцаў быў «Марш паўстанцаў 1794 года».

Супрацьстаяць аб'яднаным аўстра-венгерскім, прускім і расійскім рэгулярным арміям было немагчыма. Пасля падаўлення паўстання Агінскага зноў чакала развітанне з горача любімай ім радзімай. Праз Галіцыю ён выязджае ў Аўстрыю і восем гадоў праводзіць за мяжой: жыве ў Аўстрыі, Італіі, Францыі.

## Зноў на дзяржаўнай службе

У 1801 годзе на расійскі прастол узышоў Аляксандр I. Адным з яго найбліжэйшых сяброў быў Адам Чартарыйскі, такі ж літоўска-беларускі і польскі арыстакрат, як і М. Агінскі. Князю Чартарыйскаму ўдалося пераканаць Аляксандра I амністыраваць удзельнікаў паўстання пад кіраўніцтвам Касцюшкі. У 1802 г. дазвол вярнуцца на Радзіму атрымаў і Міхал Клеафас Агінскі. Таксама яму былі вернуты ўсе секвестраваныя маёнткі.

Паміж графам і імператарам устанавіліся прыязныя адносіны. У 1810 г. Міхал Клеафас нават атрымлівае чын тайнага саветніка і званне сенатара, а таксама ўзнагароджваецца ордэнамі св. Уладзіміра і Аляксандра Неўскага. Тым не менш граф Агінскі працягвае цяжка перажываць страту дзяржаўнасці сваёй Радзімай. Ён імкнецца знайсці спосаб ужо шляхам рэформ аднавіць ВКЛ. Падчас сустрэч з Аляксандрам I у Пецярбургу, Вільні, Віцебску, Магілёве граф асцярожна выказвае свае меркаванні аб магчымасці ўсталявання ў межах Расійскай імперыі літоўскай аўтаноміі. І яму, здаецца, удаецца пераканаць цара ў неабходнасці лібералізацыі палітыкі ў заходніх губернях імперыі. Падчас сустрэчы сенатара Агінскага з імператарам у красакавіку 1811 г. Аляксандр I ухваліў яго план і даручыў прадставіць пісьмовы праект. Разам са сваімі паплечнікамі Т. Ваўжэцкім, Л. Плятэрам, Ф. К. Любецкім і інш. Міхал Клеафас узяўся за распрацоўку праекта аднаўлення ВКЛ. У маі 1811 г. была падрыхтавана памятная запіска цару, у якой выкладаліся асноўныя палажэнні складзенага плана. У запісцы Агінскі абгрунтоўваў неабходнасць аднаўлення беларускай дзяржавы.

На пачатку 1812 г. палажэнні плана больш дэталёва былі раскрыты ў праекце канстытуцыі ВКЛ. Праектам прадугледжвалася, што з тэрыторый Гродзенскай, Віленскай, Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай, Кіеўскай, Падольскай, Валынскай губерній, Беластоцкай вобласці і Тарнопальскай акругі будзе ўтворана правінцыя пад назвай ВКЛ з галоўным горадам Вільняй. Для кіравання ВКЛ прапаноўвалася ўтварыць у Пецярбургу пры імператары Літоўскую канцылярыю на чале з міністрам статс-сакратаром, а ў Вільні – Адміністрацыйную раду пад старшынствам намесніка. Аўтары праекта лічылі неабходным прызнаць Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. асноўным грамадзянскім законам, а польскую мову – мовай справаводства. Меркавалася таксама ўтварыць у Вільні Вярхоўны трыбунал як вышэйшую судовую інстанцыю па крымінальных і грамадзянскіх справах. Прадугледжвалася, што займаць дзяржаўныя пасады ў ВКЛ будуць толькі мясцовыя ўраджэнцы. Многія прапановы былі скіраваны на развіццё адукацыі і культуры. Смелы план Агінскага выклікаў незадаволенасць

кансерватыўнай часткі расійскага ўрада, якая ўбачыла ў ім спробу расчлянення і аслаблення Расіі напярэдадні вайны 1812 г. Пад націскам шавіністаў імператар вясной 1812 г. фактычна адмовіўся ад ідэі аднаўлення ВКЛ. І ўсё ж сенатару Агінскаму ўдалося дабіцца ад імператара пэўных ільгот для Паўночна-Заходняга краю. Урадам быў выдадзены шэраг законаў аб падаткавых ільготах, дазвалялася ствараць губернскія шляхецкія камітэты, якія выконвалі асобныя функцыі органаў мясцовага кіравання.

Міхал Клеафас Агінскі шчыра клапаціўся пра дабрабыт роднага краю. Значную колькасць уласных сродкаў ён ахвяраваў на развіццё адукацыі, падтрымку таленавітых асоб. Як член Таварыства дабрачыннасці граф падтрымліваў цесныя сувязі з навукоўцамі Віленскага ўніверсітэта, удзельнічаў у пасяджэннях вучонай рады, аказваў універсітэту фінансавую падтрымку [9]. У тагачасным рэестры маёмасці ўніверсітэта значацца два мікраскопы і тэлескоп, якія падараваў універсітэту М. Агінскі.

Значныя сродкі выдаткоўваў граф Агінскі на падтрымку Маладзечненскага шляхецкага павятовага вучылішча. Так, у 1814 г. ён ахвяраваў вучылішчу вялікі збор кніг, фізічных прыбораў і музычных інструментаў, нот. Дапамагаў Міхал Клеафас таксама незаможным людзям: на сродкі Агінскага быў пабудаваны дом для бедных у Маладзечна. У сваіх успамінах «У Вільні і літоўскіх сядзібах» Габрыэля Пузыніна адзначала, што на хрэсьбінах сына Агінскага ў Залессі быў прыгатаваны пачастунак для 3 тысяч сялян. Сваім дзецям Міхал Клеафас запавядаў прыязна ставіцца да слуг і прыгонных сялян.

У віленскім палацы графа Агінскага часта збіраліся вядомыя прадстаўнікі палітычнай эліты Рэчы Паспалітай: А. Чартарыйскі, А. Тызенгаўз, Ю. Сулістроўскі, А. Прозар, Т. Ваўжэцкі, М. Ромер, С. Валовіч, Л. Плятэр, Д. Радзівіл. Падчас гэтых сустрэч, як сведчаць дакументы, абмяркоўваліся найважнейшыя праблемы эканамічнага, сацыяльнага і культурнага развіцця краіны.

Шмат увагі надаваў граф развіццю ў сваім маёнтку Залессе сельскагаспадарчай вытворчасці і рамёстваў. З закінутага, напаўразбуранага драўлянага палаца, які ў 1802 г. дастаўся графу, быў створаны велічны палаца-паркавы комплекс. За архітэктурна-паркавую дасканаласць і дзівосную прыгажосць сучаснікі далі яму назву «Паўночныя Афіны».

М. Агінскі ганарыўся сваёй прыналежнасцю да беларускага народа, высока цаніў яго духоўныя каштоўнасці, адзначаў высокія маральныя якасці беларусаў. У запісцы да Аляксандра І ён падкрэсліваў, што жыхары Літвы «спрадвеку вылучаліся ваяўнічым духам, клапаціліся пра свае правы і былі верныя сваім манархам, вызначаліся мужнасцю і любоўю да Бацькаўшчыны. Гордыя сваім паходжаннем, ліцвіны, нягледзячы на аб'яднанне сваёй правінцыі з Польшчай, захавалі свае звычаі, свой грамадзянскі кодэкс, мясцовае кіраванне... Усе гэтыя прывілеі былі такімі дарагімі для ліцвінаў, што, нягледзячы на ўсялякія намаганні і красамоўныя адгаворы, немагчыма было схіліць ліцвінаў адмовіцца ад сваіх прывілеяў» [6, с. 27].

## Кампазітар і музыказнаўца

Усё свядомае жыццё Міхал Клеафас Агінскі праяўляў актыўную цікавасць да мастацтва, мастацкай творчасці. Аб гэтым сведчаць, у прыватнасці, яго навуковыя працы «Назіранні над музыкай» і «Лісты пра музыку» (напісаныя ў перыяд з 1802 па 1828 г.), а таксама чатыры тамы «Мемуараў пра Польшчу і палякаў з 1788 па 1815 г.». «Назіранні над музыкай» складаюцца з двух раздзелаў: «Захапленне музыкай грэкаў і рымлян. Уздзеянне, якое яны прыпісвалі гэтаму мастацтву», «Паходжанне музыкі. Для чаго яе выкарыстоўвалі старажытныя грэкі і да якой ступені яны развілі гэтае мастацтва» [7, с. 309]. У першай частцы М. Агінскі аналізуе тэкст IV кнігі «Усеагульнай гісторыі» Палібія, у прыватнасці, главы, у якіх вучоны антычнасці разважае пра ролю музыкі ў жыцці і выхаванні жыхароў грэчаскай Аркадыі. Кампазітар падтрымлівае ідэю ўсеагульнага навучання музыцы, якое было істотнай часткай выхавання моладзі ў Аркадыі. Так, у краіне існаваў закон, паводле якога ўсе жыхары ва ўзросце да 30 гадоў былі абавязаны навучацца музыцы.

У другой частцы трактата М. Агінскі разважае над праблемай паходжання музыкі і яе ўздзеяння на чалавека. Аўтар вылучае гіпотэзу аб паходжанні музыкі з птушыных спеваў, сваю думку ён падмацоўвае выказваннямі на гэты конт Плутарха і Мантэня. Першабытны чалавек быў цесна знітаваны з прыродай, слухаў спевы розных птушак і спрабаваў імітаваць іх галасам і рознымі прыстасаваннямі. Такім чынам паступова з'явілася вакальная і інструментальная музыка. Тут жа М. Агінскі разважае над пытаннямі выкарыстання музыкі ў псіхатэрапеўтычнай дзейнасці. Ён адзначае спецыфічныя і ўнікальныя магчымасці мэтанакіраванага ўздзеяння музыкі на змяненне псіхалагічнага і саматычнага стану чалавека. Рытм, мелодыя і гармонія, паводле сцвярджэння аўтара, здольныя пранікаць у глыбіню псіхікі і такім чынам аказваць дабратворны ўплыў на экзістэнцыяльны стан чалавека. Меркаванні музыказнаўцы пацверджаны практыкай сённяшняй музыкатэрапіі.

Не меншую цікавасць уяўляюць для нас «Лісты пра музыку» М. Агінскага. Складаюцца яны з пяці частак [7, с. 313]. Першая і другая часткі прысвечаны разважанням аўтара пра ўласную музычную творчасць. М. Агінскі сціпла ацэньвае свой уклад у музычнае мастацтва, падкрэслівае яго аматарскі характар. «Усё, што я маю, – піша ён, – гэта добры слых, глыбокае пачуццё гармоніі і густ, якія я ў сабе выхаваў, слухаючы і часта займаючыся добрай музыкай» [1, с. 91]. Між тым музычна-мастацкая спадчына Міхала Клеафаса Агінскага складаецца з 20 паланэзаў, 60 вакальных і інструментальных

твораў, оперы «Зеліда і Валькур, ці Напалеон у Каіры». (Лібрэта апошняй напісана пад уплывам сустрэчы кампазітара з Напалеонам у 1807 г. у Італіі. М. Агінскі імкнуўся зацікавіць французскага імператара ідэяй утварэння ВКЛ пад патранажам Францыі. Але дадзены праект не зацікавіў Напалеона. Расчараваўшыся ў французскім імператары, Агінскі нават хацеў знішчыць свой музычны твор, прысвечаны Банапарту.)

У трэцяй частцы «Лістоў» гутарка вядзецца аб месцы музыкі ў грамадствах старажытнасці, даецца параўнальны аналіз народнай музыкі розных краін свету. У апошнім раздзеле твора аўтар разглядае эвалюцыю некаторых музычных інструментаў і асвятляе стан вакальнага і інструментальнага мастацтва Еўропы XVIII–XIX стст.

Аналіз узгаданых твораў М. Агінскага дазваляе нам сцвярджаць, што ён быў не толькі творцай, але і дасведчаным мастацтвазнаўцам, які ў дасканаласці ведаў тэорыю і гісторыю музыкі. Паводле меркавання кампазітара, толькі ў музыцы мастацтва набліжаецца да таямніц жыцця, да самых глыбінных яго асноў. «Немагчыма, – адзначаў ён, – з большай годнасцю і з такім розумам выявіць перавагу гэтага прыгожага мастацтва і даць зразумець яго вялікую сілу ўздзеяння на звычаі з мэтай іх выпраўлення і змякчэння» [6, с. 28]. Рамантычны культ музыкі знайшоў сваё ўвасабленне ў кампазітарскай творчасці і даследчай дзейнасці М. К. Агінскага.

Асабліва плённым для музычнай творчасці М. Агінскага быў залескі перыяд (1802–1806 гг.). Менавіта на беларускай зямлі яна дасягнула кульмінацыі. У сваім маёнтку кампазітар заснаваў музычны салон, вядомы нават за межамі Беларусі. Паводле сцвярджэння беларускіх даследчыкаў А. І. Ахвердавай і А. Л. Капілава, салон Агінскага быў «асяродкам сур'ёзнай музычнай дзейнасці, дзе зборы праводзіліся рэгулярна, мелі пастаянны склад выканаўцаў і слухачоў, на канцэрты запрашаліся знакамітыя выканаўцы» [4, с. 7]. Аб гэтым паведамляе і польскі гісторык і публіцыст Ч. Янкоўскі: «У Залессі звычайна выконваліся квартэты альбо якія-небудзь новыя творы. Сам князь звычайна іграў першую скрыпку; Эскудэра – іспанец родам, вельмі добры скрыпач, ігру якога ведалі ў Вільні, дзе ён неаднаразова выступаў з канцэртамі, іграў другую скрыпку. Партыю віяланчэлі выконваў даўні сябра сямейства Восіп Казлоўскі, які шмат гадоў быў у Пецярбургу пры царскім двары настаўнікам сясцёр цара, закончыўшы там службу, пераехаў на жыхарства да князя, якога вучыў у маладосці» [8, с. 97].

Думаецца, асоба Міхала Клеафаса Агінскага, яго духоўны свет, каштоўнасна-сэнсавыя ўстаноўкі, лад жыцця, высакароднасць, арыстакратычны кодэкс гонару, рэлігійнасць, адукаванасць могуць стаць узорам для сучаснай беларускай моладзі, садзейнічаць умацаванню маральных асноў нашых юных суграмадзян.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Верамейчык, С. І.** Міхал Клеафас Агінскі, 1765–1833 / С. І. Верамейчык. – Мінск: Кавалер, 2008. – 128 с.
2. **Грыцкевіч, А. П.** Памятныя запіскі М. К. Агінскага Аляксандру І у 1811 г. / А. П. Грыцкевіч // Адраджэнне: гіст. альманах / склад. і навук. рэд. А. П. Грыцкевіч. – Мінск, 1995. – Вып. І. – С. 195–223.
3. **Залуский, А.** Время и музыка Михала Клеофаса Огинского / А. Залуский. – Минск: Четыре четверти, 1999. – 189 с.
4. **Капилов, А. Л.** Музыкальная культура Беларуси XIX – начала XX века / А. Л. Капилов, Е. И. Ахвердова. – Минск: Институт современных знаний, 2000. – 144 с.
5. **М. Клеафас Агінскі**. Мая біяграфія: з дзяцінства па 1788 г., эпоху, калі канчаюцца мае мемуары / М. К. Агінскі; пер. Т. Кляшчонак і А. Рабцавай // Спадчына. – 1998. – № 5. – С. 81–99; № 6. – С. 226–237.
6. **Міхал Клеафас Агінскі** (1865–1833) / укл.: К. А. Цвірка, І. С. Шпакоўскі, К. У. Антановіч, навук. рэд. А. В. Мальдзіс // Літаратура Беларусі XIX стагоддзя: анталогія. – Мінск: Беларус. навука, 2013. – С. 27–28.
7. **Немагай, С.** Жыццё і творчасць М.К.Агінскага ў каардынатах яго часу і культурнага асяроддзя / С. Немагай. – Мінск, 2007. – 519 с.
8. **Jankowski, Cz.** Powiat Oszmianski / Cz. Jankowski. – T. 2. – Petersburg, 1897. – S. 196.
9. **Ustawy Nowarzystwa dobraczennosci**. – Wilno: Druk. Zawadzkiego, 1808. – 22 s.



Падпісана да друку 16.02.2015. Папера афсетная. Фармат 60x84 1/8. Гарнітура «Georgia». Друк афсетны.
Фіз. друк. арк. 12. Ум. друк. арк. 11,16. Ул.-выд. арк. 9,2. Тыраж 2097 экз. Зак. 452
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі СМІ №709 ад 30.07.2010.
Адрас рэдакцыі: 220023, Мінск, вул. Макаёнка, 12.
Афіцыйны сайт у Інтэрнэце www.n-asveta.by, адрас электроннай пошты info@n-asveta.by
Тэлефоны: 267-62-68, 267-64-69, 267-33-97.
Установа «Рэдакцыя газеты «Настаўніцкая газета» Філіял «Рэдакцыя часопіса «Народная асвета».

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку» (ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004).
220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79.